Таццяна Марозава

МАРАЗМЫ

Маразмы – жанр армейскага (салдацкага) фальклору. Мае вусную і пісьмовую форму бытавання. Упершыню маразмы пачалі фіксаваць студэнты, якія наведвалі заняткі на ваенных кафедрах вышэйшых навучальных устаноў, а таксама іншыя штацкія, якія траплялі на ваенныя зборы. Як адзначаюць рускія даследчыкі В. Галавін, М. Лур'е і Я. Куляшоў, «у невялікай колькасці маразмы сустракаюцца на старонках салдацкіх блакнотаў, а некаторыя з іх (тыпу «Копать будем от забора и до обеда») – і ў вусным бытаванні, выступаючы ў якасці іранічнай формулы, такім чынам апісваючы «дух арміі». Як правіла, маразмы цытуюць з указаннем на канкрэтнага чалавека: *«Как говорил наш майор на сборах…»* Рысы маразмаў: страта гаворачым прычынна-выніковых сувязей, уласцівых звычайнаму свету *(«Что у вас нос красный, как огурец?»*); імкненне да афарыстычнасці, каб самае зразумелае і натуральнае было выражана ў выглядзе ўстаўной фармуліроўкі *(«Расстояние между ногами − один шаг»; «Ядерная бомба всегда попадает в эпицентр»*); наяўнасць прыёма пародыі, які несвядома выкарыстоўваецца ў мове афіцэраў (*«Не делайте умное лицо, не забывайте, что вы будущий офицер»*; *«Танки наступают небольшими группами, по 2 – 3 человека»*; *«Вы солдат или где? Вы в строю или кто?»*); шматлікія скажэнні фразеалагізмаў, якія прыводзяць да камічнай двухсэнсоўнасці *(«Я все время спускал вам сквозь пальцы, но если я кого-нибудь поймою за что, то это будет его конец», «Запишите себе на ус», «Вы у меня в кишках по горло сидите»).*

У артыкуле выкарыстаны прыклады з рэгіянальнага архіва вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору пры кафедры тэорыі літаратуры БДУ.

ЛІТАРАТУРА

1. *Головин, В. В.* Субкультура солдат срочной службы / В. В. Головин, Лурье М. А., Кулешов Е. В. // Современный городской фольклор / ред. А. Ф. Белоусов и др. − М., 2003. − С. 186-230.

2. *Марозава, Т.* Армейскі (салдацкі) фальклор / Т. Марозава // Фальклярыстычныя даследаванні: кантэкст, тыпалогія, сувязі: зб. артык. / пад рэд. Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка. − Мінск: РІВШ, 2010. − С. 355-357.

3. *Марозава, Т. А.* Сучасны салдацкі (армейскі) фальклор Беларусі: умовы функцыянавання, формы бытавання / Т. А. Марозава // Фальклор і сучасная культура: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., 22-23 крас. 2008 г., г. Мінск. У 2 ч. / рэдкал.: Роўда І. С. [і інш.] − Мінск, БДУ, 2008. Ч. 1. − С. 51–54.